**Литература**

1. Улицкая, Л. Сквозная линия: Повесть. Рассказы / Л. Улицкая. – М., 2008. – 320 с.
2. Улицкая, Л. Люди нашего царя / Л. Улицкая. – М., 2005. – 368 с.
3. Улицкая, Л. Бедные родственники: Рассказы / Л. Улицкая. – М., 2002. – 224 с.



**І.І. Шматкова** (Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт)


## ЧАЛАВЕК–ДАБРЫНЯ–ЛЮБОЎ У ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ПАЭТЭС ДРУГОЙ ПАЛОВЫ ХХ СТ.

Пытанне аб духоўных ідэалах з'яўлялася актуальным ва ўсе часы. Чалавек яшчэ з часоў старажытнасці адчуў патрэбу ў духоўным самавыяўленні. Менавіта маральна-гуманістычныя ідэалы леглі ў аснову мастацкага свету беларускай "жаночай" паэзіі другой паловы ХХ стагоддзя.Увасабленне гуманістычных ідэй у творчасці беларускіх паэтэс – з'ява адметная, бо яны не дагматызуюць вечныя ісціны і каштоўнасці, не дэкларуюць іх, а прапускаюць праз сваё сэрца і жыццё.

Чалавек – адзін з галоўных вобразаў у творчасці паэтэс. Як сцвярджае М. Бярдзяеў, "чалавек – мікракосмас, цэнтр быцця, сонца, вакол якога ўсё круціцца. Усё ў чалавеку і для чалавека. У чалавеку – загадка сусветнага жыцця" [1; 263]. Н. Шклярава стварае верш-хваласпеў "Чалавек", у якім рэфрэнам у трох строфах праходзіць гэта слова з вялікай літары: "Ён – // Чалавек" [2; 10]. Але хто ж ён, "вянец тварэння"? Гэтым пытаннем здаўна цікавяцца філосафы і паэты. Разгадку яны знаходзяць унутры самога чалавека.

Н. Мацяш у вершы "Зазірні ў сябе" заклікае чалавека ўгледзецца ў свой унутраны свет, дзе ёсць усё, адчуць у ім грахоўнае і светлае: "Ёсць такі куток, // Дзе чарней начы асенняй // Змрочны мкне паток" і "Ёсць такая шыр, // Дзе пануе неасяжны // Шчасцямоўны мір" [3; 215–216]. І змрочнае, і боскае суіснуе ў адной і той жа істоце – чалавеку. З аналагічнай просьбай звяртаецца паэтэса да чытача, разважаючы: "Здаецца ж, і лёс наш не цёмны, // І час не глухі наш...", але ж чалавек працягвае "блукаць", "у ваколле ўзіраецца // Напружаней і пільней" [3; 83]. І тут, здаецца, на дапамогу чалавеку прыходзіць сусвет: "Часцей пераходзяць дарогу // І зорка, і рыбіна, й звер, // Каб мы адшукалі нарэшце // Сябе – // Чалавека" [3; 83].

Чалавечае ў чалавеку – гэта і ёсць яго духоўная, гуманная сутнасць. На першы план у светаразуменні Н. Мацяш выступаюць чалавечыя якасці. У адным з вершаў паэтэса гаворыць, што галоўнае, "каб людзі ў шматмільярдным стане // Нарэшце зваліся людзьмі!" [3; 155]. І далей: "О, боязнь за другога чалавека!.. // Адна ты робіш чалавека з нас" [3; 101]. Г.Каржанеўская нібы салідарызуецца з Н. Мацяш: "У чалавеку // Людское мне дарага" [4; 69]. Яна перакананa, што ўсяму патрэбна чалавечае цяпло: і траве, і рацэ, і душы, "каб у ёй не было // зацятасці згубнае, // вартае жалю" [4; 4].

Чалавечы свет з макракосмасам аб'ядноўвае вобраз сонца, якое дае сусвету цяпло і святло. Чалавек – таксама крыніца цяпла і святла. Тым не менш, паўстае пытанне, на якое ўвесь час людзі шукаюць адказ: у чым сэнс чалавечага жыцця? Беларускія паэтэсы неаднаразова ў сваіх творах уздымаюць гэта пытанне і даюць на яго шматлікія адказы.

Лірычная гераіня вершаў К. Буйло бачыць галоўны сэнс існавання ў тым, каб "Тварыць дабро. Тварыць дабро..." [5; 152], яшчэ раз напамінаючы: "Не, ты не вечны, чалавек! // І ў цябе не многа часу <...> Сей добрае! Няхай узыдзе шчыра... // Усё дай людзям, што ты маеш сам!" [5; 176]. Е. Лось у зборніку "Хараство" сцвярджае: "Жыць не магу без дабраты, // Як жаўранак без песні" [6; 13]. Паэтэса захапляецца жыццём, калі ў ім валадарыць закон дабрыні: "Сонечна над краем, // Хораша ў жыцці! // Большы памагае // Меншаму расці" [6; 48]. Свой зборнік паэтэса пачынае вершам-эпіграфам, у якім услаўляецца жыццё разам з добрым чалавекам: "Хвала жыццю, няўрымслівым – хвала! // Святлее хлеб, дабрэе чалавек, // А чарната, калі яшчэ была, // Сціраецца,

Репозиторий ВГУ

сціраецца навек” [6; 3]. Сэнс жыцця Е. Лось бачыць у хваляванні і клопатах пра іншых, у сяброўскай падтрымцы: “І каб не сябра мой – дубок, // Які патрэбна // даглядаць; // І каб не рань, // і каб не сінь, // І каб не чулы // другаў ліст, – // Магчыма, існавала б я, // А так – жыву і буду жыць!” [6; 34]. У вершы “Тры добрыя справы” паэтэса прыгадвае народнае выслоўе-жарт аб трох справах: для людзей, саду і зямлі, выканаўшы якія, чалавек, можна лічыць, спраўдзіў сваё прызначэнне на зямлі. Пра добрыя адносіны Е. Лось да людзей сведчыць і ліст да яе Т. Бондар: “...Вы правы, калі гаворыце аб цяжкасцях шляху паэтава, аб адзіноце, якая чакае на гэтым шляху кожнага. І ўсё-ткі! Хіба ж Ваша дабрата, з якой вы адносіцеся да кожнага, хто звяртаецца да вас, не аспрэчвае штосьці ў гэтым?” (19 красавіка 1976 г.) [7; 1].

У паэзіі Р. Баравіковай назіраецца разгублены стан лірычнай гераіні з-за недасканаласці свету, перададзены ўжо самімі назвамі вершаў – “Чаму?”, “Навошта... навошта... навошта?!” Паэтэсе хочацца верыць: “Гавораць жа, свет – з дабрыні” [8; 157]. А лірычная гераіня Я. Янішчыц складае ў сваім уяўленні ідэлізаваны малюнак Сусвету, акцэнтуючы ўвагу на маштабнасці сваіх памкненняў устаўной канструкцыяй у сярэдзіне сказа: “І паўсюль – на свеце! – дабрыня” [9; 322].

Н. Мацяш надзяляе дабрыню чалавекастваральнай сілай: “Дабрата // не імпульс, // не парыў, // Не адзінкавы ўсплёск эмоцый, // Калі ёй нададзена тварыць // Чалавека з болю // і самоты” [3; 133]. Паэтэсу непакоіць, што ў сучасным свеце так мала людзей, якія захоўваюць дабрыню, міласэрнасць: “І як мала, як мала між люду такіх, // Хто ва ўласнай хадзе па выбоях // Зберагае, як найдарагое, // Чысты вынік свайго міласэрдзя ва ўсіх, // Сам аж свеціцца хто дабратою” [3; 217].

“Наталі маю прагу дабра” [10; 239], – просіць лірычная гераіня Г.Каржанеўскай. Яна здольна спачуваць не толькі чалавеку (напрыклад, жанчыне, у якой загінуў сын), але і палёўцы ў кіпцях каршуна, “зубку касача”, што прабіваецца з глебы, асе, што “ломіцца ў шыбу... І нават з’явы прыроды – снег і ручаёк – “Праз лінзу жальбы успрымае зрок” [10; 181]. У такіх выпадках кажуць пра высокі ўзровень эмпатыі (ад грэч. “empatheia” – суперажыванне). Якасць, безумоўна, станоўчая, але робіць асобу ранімай, адкрытай чужому болю.

Беларускія паэтэсы, такім чынам, прыходзяць да высновы аб жыццесцвярджальнай моцы чалавечай дабрыні. Іх творчасць грунтуецца на актуалізацыі маральнага сэнсу жыцця асобы. Яны ўспрымаюць агульначалавечае як вызначальнае, бачаць духоўнае прызначэнне чалавека ў служэнні Дабру.

Шырока ў творчасці беларускіх паэтэс прадстаўлена гуманістычная катэгорыя, якая з’яўляецца “ўніверсальным пабуджальным матывам да ўсіх добрых спраў” [11; 35], – вялікая і мудрая любоў. Любоў валодае ўсёмагутнай сілай. М. Бярдзяеў зазначае: “Любоў – у ёй глыбіня чалавечай прыроды” [1; 314]. Усеабдымная любоў чулага сэрца акрыляе жаночую паэзію. Слушна разважае аб ролі ў жыцці чалавека гэтай найвышэйшай катэгорыі Т. Бондар, у творчасці якой маральна-гуманістычныя матывы і рэлігійная традыцыя сталі вызначальнымі: “Сіла – не ў паняверцы, // У любві. І павер, // Самы большы памер // Рэчаіснасці – сэрца” [12; 48].

Н. Мацяш не баіцца сказаць усяму свету: “Жыву! // Люблю! // Не наталюся!” [3; 51]. Любоў дае сілы жыць, без яе жанчына сябе не ўяўляе: “Як магла б я паведаць // Прагу жыць – // без цябе? // Дзе б я чэрпала сілы // Усміхацца, спяваць? // <...> Безаглядная любасць, Вечны корань душы...” [3; 155]. Калі сэрца перапоўнена любоўю, “Можа, адзіна цяпер мы і варты // Жыцця” [3; 173], – даводзіць паэтэса. Н. Мацяш упэўнена ва ўсёпераможнай моцы любові: “Не трэба пытацца, што можа // Любоў наша, еднасць людская...” [3; 177]. У вершы “Збыліся” паэтэса яшчэ раз сцвярджае добра вядомую формулу быцця: я люблю – значыць жыву. “Мы ёсць. // Мы збыліся” [3; 228], калі кахаем, напоўнены пачуццём любові.



Репозиторий ВГУ

Г. Каржанеўская ў лірычнай драме “Асенні мёд” строга падзяляе пачуцці: “Вы мне пра каханне, // а я пра Любоў” [4; 152], узвышаючы святое пачуццё, нават пішучы яго з вялікай літары. Спаўна асэнсаваўшы духоўную значнасць яго для чалавека, паэтэса гатова аддаць за яго ўсё: “За новае, яснае ў сэрцы святло // Аддам і гардыню, // і страсць, // і свабоду я” [4; 153].

Адметнасцю творчай асобы Г. Каржанеўскай стала раскрыццё ў гэтай вялікай маральнай каштоўнасці такога ракурсу як шкадаванне, так называемай любові-агапэ, ахвярнай і самаадданай: “Навучыліся шкадаваць. // Шкадаванне любові вышай” [4; 142]. У гэтым бачыцца еднасць яе лірычнай гераіні з гераіняй Г. Ахматавай, для якой “міласэрнасць, спагада, жаль – асноўныя праявы карытатыўнай любові, што ўспрымаецца водгаласам ідэй рускіх філосафаў артадаксальна-багаслоўскага напрамку (П. Фларэнскага, С. Булгакава, М. Лоскага і інш.)” [13; 10].

Менавіта ў творчасці Г. Каржанеўскай катэгорыя любові набывае выразнае хрысціянскае гучанне. Вызначаючы канцэптуальную асаблівасць сваёй творчай асобы, паэтэса піша: “І звязаная з небам, // як антэна, // Усіх люблю // і цешуся праменна” [4; 120]. Асэнсоўваючы параўнанне “як антэна”, дарэчы ўзгадаць словы паэта-сучасніка А. Разанава: “Чалавек, творачы, ужо больш, чым сам, ужо далей, чым тут. Ён, як антэна, змястоўны не сабой, а пазасабовасцю. І чым менш у ім самога сябе, яго самаснасці, тым больш ён чуйны, тым больш востры, тым больш ён усё, увесь Сусвет” [14; 25].

Такім чынам, трыяда такіх адвечных агульначалавечых каштоўнасцейяк чалавек – дабрыня – любоў склала аснову мастацкага светаразумення беларускіх паэтэс, якія пераасэнсоўвалі вечныя ісціны і катэгорыі быцця, пры гэтым адбываўся працэс самапазнання, паглыблення маральна-гуманістычнага зместу іх лірыкі. Іх паэзія характарызуецца тыпалагічным падабенствам ва ўвасабленні гуманістычных канцэпцый. Чалавек стаў асновай творчасці беларускіх паэтэс, іх духоўна-філасофскага асэнсавання свету, зрабіўся мерай усіх рэчаў. Паэтэсы ўзвышаюць выключную, асаблівую моц чалавечай дабрыні, у якой заключаны маральны сэнс жыцця чалавека. У беларускай “жаночай” лірыцы другой паловы ХХ ст. дамінуе ідэя вялікай гуманістычнай любові, якая з’яўляецца ўніверсальным пабуджальным матывам да ўсіх добрых спраў.

## Літаратура


1. Бердяев, Н.А. Русская идея / Н.А. Бердяев. – Харьков: Фомо; М.: ООО “Изд-во АСТ”, 2000. – 400 с.
2. Шклярава, Н. Міг і вечнасць: вершы / Н. Шклярава. – Мінск: Маст. літ., 1979. – 72 с.
3. Мацяш, Н. Паміж усмешкай і слязой: вершы і паэмы (1962 – 1992) / Н. Мацяш. – Мінск: Маст. літ., 1993. – 301 с.
4. Каржанеўская, Г. Асенні мёд: вершы розных гадоў / Г. Каржанеўская. – Мінск: Маст. літ., 1999. – 159 с.
5. Буйло, К. Коціцца рэха: вершы, паэма, лісты / К. Буйло. – Мінск: Маст. літ., 1993. – 286 с.
6. Лось, Е. Хараство: лірыка / Е. Лось. – Мінск: Беларусь, 1965. – 131 с.
7. Ліст Т. Бондар да Е. Лось // БДАМЛМ. – Фонд 141. – Воп. 3. – Адз. зах.113. – Арк.1.
8. Баравікова, Р.А. Дрэва для райскай птушкі: лірыка / Р.А. Баравікова; прадм. І. Штэйнера. – Мінск: Маст. літ., 2007. – 270 с.
9. Янішчыц, Я. Пачынаецца ўсё з любві...: вершы, паэмы / Я. Янішчыц. – Мінск: Маст. літ., 2008. – 339 с.
10. Каржанеўская, Г. Невымоўнае: вершы / Г. Каржанеўская. – Мінск: Маст. літ., 1991. – 287 с.
11. Жураўлёў, В.П. У пошуку духоўных ідэалаў: на матэрыяле беларускай літаратуры ХІХ – пачатку ХХ ст. / В.П. Жураўлёў; НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; пад рэд. У.В. Гніламёдава. – Мінск: Беларус. навука, 2000. – 191 с.
12. Бондар, Т. ...І голас набыла душа: вершы і паэмы / Т. Бондар. – Мінск: Маст. літ., 1980. – 111 с.
13. Брадзіхіна, А.В. Сучасная беларуская інтымная лірыка: генезіс, тэндэнцыі развіцця, кантэкст: аўтарэф. ... дыс. канд. філал. навук: 10.01.01; 10.01.08 / А.В. Брадзіхіна; НАН Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – Мінск, 2005. – 22 с.
14. Разанаў, А.С. Сума немагчымасцяў: зномы / Алесь Разанаў – Мінск: І.П. Логвінаў, 2009. – 122 с.


Рэпазіторый ВДУ